**БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

вул. Леніна, 11, 224005, Брэст, 5
тэл. (8-0162) 20 98 12, факс 21 96 66
e-mail: contact@brest-region.by

р/р 3604000000557 у філіяле 100
Брэсцкага АУ ААБ «Беларусбанк»
УНП 200257008, МФО 246

**БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

ул. Ленина, 11, 224005, Брест, 5
тел. (8-0162) 20 98 12, факс 21 96 66
e-mail: contact@brest-region.by

р/с 3604000000557 в филиале 100
Брестского ОУ АСБ «Беларусбанк»
УНП 200257008, МФО 246

16.03.2017 № 04-22/13/3э

На № ________ от ______________

[redacted]

Паважаная [redacted]!

Ваш зварот ад 27.02.2017 аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь драўлянаму будынку па вул. Калініна, 15 у г.Давыд-Гарадку Столінскага раёна, ў аблвыканкаме разгледжаны.

Драўляны будынак былой гасцініцы па вул. Калініна, 15 дасканала пабудаваны ў 1936 годзе, уяўляе сабой адметны вобраз архітэктуры, але не з'яўляецца унікальным.

Згодна з экспертным меркаваннем доктара архітэктуры, прафесара С.А.Сергачова яго архітэктура заснавана на выкарыстоўванні прыемаў тыповай гарадской архітэктуры таго часу. Мастацкі вобраз фарміруе выразнасць простых форм, буйнамаштабнасць ваконных праёмаў, тыповых для той часткі Беларусі, дэкаратыўнасць разьбы налічнікаў вокан і франтонаў двусхільнага даху. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў доме некалькі разоў былі зроблены частковыя змены (замена дзвярных і ваконных праемаў, даху будынка, праведзены цэнтральнае ацяпленне, вадаправод і каналізацыя, пабудаваны невялікі ганак з навесам, а так сама сцены будынка знадворку былі абшыты драўлянай шалёўкай).

Такім чынам, у выніку пасляваенных рэканструкцый, будынак страціў першапачатковы выгляд. У сувязі з гэтым, лічым немэтазгодным наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь драўлянаму будынку, размешчанаму па вул. Калініна, 15 у г.Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкая вобласці.

У выпадку нязгоды з гэтым адказам Вы маеце права абскардзіць яго ў парадку, усталяваным артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18.07.2011 № 300-З «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб».

Намеснік старшыні аблвыканкама В.Я.Сакоўскі

39. Фоцін 21 35 26
ПН 14.03.2017 Зварот [redacted]